**УДК 271-055.2** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-79-3-51-54**

# ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ ДЗЕЙНАСЦІ РЫМСКА-КАТАЛІЦКІХ ЖАНОЧЫХ МАНАСКІХ КАНГРЭГАЦЫЙ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

***Ю.А. АЎСЕЙЧЫК***
***(Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік)***

*У артыкуле разгледжана айчынная і замежная гістарыяграфія, прысвечаная дзейнасці жаночых манаскіх кангрэгацый на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у міжваенны перыяд. Прааналізаваны асноўныя напрамкі навуковых прац царкоўных (як беларускіх, так і польскіх) і свецкіх даследчыкаў. Прасочаны асноўныя этапы развіцця беларускай і польскай гістарыяграфіі.*

***Ключавыя словы:*** *беларуская гістарыяграфія, польская гістарыяграфія, Рымска-каталіцкі касцёл, манаская супольнасць, кангрэгацыі, міжваенны перыяд, заходнебеларускія землі.*

**Уводзіны.** Пасля падпісання 18 сакавіка 1921 г. Рыжскай мірнай дамовы тэрыторыя Беларусі была падзелена на дзве часткі: заходнюю і ўсходнюю. Заходняя частка, якая ўключала ў сябе Гродзенскую губернію, Навагрудскі, Пінскі, частку Мінскага, Слуцкага і Мазырскага паветаў Мінскай губерніі, Віленскі, Лідскі, Дзісненскія паветы Віленскай губерніі, была далучана да ІІ Рэчы Паспалітай. Згодна з Канстытуцыяй Польшчы ад 17 сакавіка 1921 г., у дзяржаве замацоўваўся прынцып свабоды сумлення і веравызнання (арт. 111). Але ў той жа час у ёй была замацавана “галоўная пазіцыя сярод раўнапраўных веравызнанняў” каталіцкага касцёла (арт. 114) [1, s. 140]. Канкардат 1925 г. з Ватыканам і Канстытуцыя 1935 г. яшчэ мацней замацавалі прывілеяванае становішча Каталіцкага Касцёла. Такім чынам, дзяржаўная рэлігійная палітыка, якая ажыццяўлялася ў Польшчы ў міжваенны перыяд, спрыяла развіццю рымска-каталіцкіх манаскіх супольнасцей і заснаванню новых.

Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць гісторыю вывучэння дзейнасці жаночых манаскіх рымска-каталіцкіх супольнасцей на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у 1921–1939 гг.

**Асноўная частка.** Як вынікае з аналізу крыніц, на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. існавалі наступныя жаночыя манаскія каталіцкія супольнасці: Сясцёр Місіянерак Святой Сям’і (місіянеркі), Сясцёр Служабніц Езуса ў Эўхарыстыі (эўхарысткі), Сясцёр Святой Сям'і з Назарэту (назарэтанкі), Сясцёр Святога Арханёла Міхаіла (міхаліткі), Сясцёр Змёртвыхпаўстання Хрыста (змёртвыхпаўстанкі), Сясцёр Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Марыі Панны (непакалянкі), Сясцёр Місіянерак Каталіцкага Апостальства (палатынкі), Сясцёр Бенедыктынак, Сясцёр Уршулянак Сэрца Езуса Канаючага (уршулянкі), Сясцёр Міласэрнасці Св. Вінцэнта дэ Поля (шарыткі), Сясцёр Сям’і Марыі (францішканкі); безхабітовыя – Сёстры Францішканкі ад Пакутуючых (францішканкі), Сёстры Служкі Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі (служкі), Сёстры ад Анёлаў (анелянкі).

Нягледзячы на даволі значную ролю жаночых манаскіх супольнасцей у місіянерскай, дабрачыннай і адукацыйнай дзейнасці на беларускіх землях у міжваенны перыяд, у айчыннай гістарычнай навуцы дадзеная тэма не знайшла належнага асвятлення. Грунтоўных прац, у якіх прасочана дзейнасць жаночых каталіцкіх манаскіх супольнасцей на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у пазначаны перыяд, не існуе. Трэба адзначыць, што ў беларускай савецкай гістарыяграфіі другой паловы ХХ ст. дадзеная праблематыка ўвогуле абміналася, што было абумоўлена негатыўнымі адносінамі камуністычнай партыі да дзейнасці Рымска-каталіцкага касцёла. І толькі з 1990-х гг. з’яўляюцца першыя працы, дзе разгледжаны некаторыя аспекты дзейнасці каталіцкіх манаскіх супольнасцей у міжваенны перыяд. Адметнай асаблівасцю гэтых публікацый было тое, што іх аўтарамі выступалі пераважна прадстаўнікі каталіцкага духавенства, альбо гэтыя працы выходзілі пад патранажам касцёла.

У 2001 г. па ініцыятыве Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі была падрыхтавана і выдадзена кніга “Ружанцовыя разважанні” [2]. У ёй прадстаўлены біяграфіі святых і благаслаўлёных, лёс якіх быў звязаны з беларускай зямлёй. Сярод узгаданых у кнізе дзеячоў ёсць сёстры назарэтанкі (11 пакутніц з Навагрудка, якія працавалі там у міжваенны перыяд), сёстры непакалянкі (Ева Найшэўская і Марта Валоўская) і іншыя духоўныя асобы, дзейнасць якіх непасрэдна звязана з перыядам знаходжання заходнебеларускіх зямель у складзе ІІ Рэчы Паспалітай. У 2005 г. па той жа ініцыятыве была выдадзена праца “Пра пакліканне” [3]. У кнізе падаецца кароткая гісторыя стварэння і дзейнасці мужчынскіх і жаночых кангрэгацый, якія працавалі на беларускіх землях.

Фактычна адзінай публікацыяй энцыклапедычнага характару, дзе можна знайсці звесткі па дадзенай праблематыцы, з’яўляецца выданне “Рэлігія і царква на Беларусі” [4]. У ім утрымліваюцца некаторыя звесткі пра жаночыя рымска-каталіцкія манаскія супольнасці, якія працавалі на заходнебеларускіх землях (“назарэцянак”, “урсулінак”), а таксама тлумачэнне манаскай тэрміналогіі.

У 2005 г. у Каталіцкім універсітэце ў Любліне каталіцкім святаром з Ордэну марыянаў А. Жарнасекам была абаронена магістарская праца “Dzieje marianów w Drui w latach 1923–1938” [5]. У адным з яе радзелаў закранаецца тэма стварэння супольнасці сясцёр эўхарыстак і апека над ёй марыянамі ў Друі ў 1920-я гг. У працы былі выкарыстаны крыніцы Архіва беларускіх марыянаў. У тым жа годзе ў Варшаве была абаронена яшчэ адна магістарская праца “Apostolski wymiar charyzmatu Zgromadzenia Siostr Sluzebnic Jezusa w Eucharystii” [6],

прысвечаная супольнасці эўхарыстак. Яе аўтарам з'яўляецца эўхарыстка Н. Арлянковіч. Для аналізу дзейнасці супольнасці аўтарам быў выкарыстаны комплекс дакументаў, якія знаходзяцца ў Архіве Супольнасці Сясцёр Служабніц Езуса ў Эўхарыстыі ў Прушкаве (Польшча).

Праца марыяніна А. Надсана "Pro patria aliena. Кляштар беларускіх айцоў марыянаў у Друі (1924–1938)" [7], выдадзеная ў 2006 г., прысвечана гісторыі ўзнікнення і развіцця кляштару беларускіх айцоў марыянаў у Друі ў міжваенны перыяд. Так як заснавальнік кангрэгацыі сясцёр эўхарыстак быў віленскі біскуп Юры Матулевіч, то гісторыя ўзнікнення дадзенай супольнасці непарыўна звязана з дзейнасцю айцоў марыянаў. У працы А. Надсана былі выкарыстаныя шматлікія, у большасці, дагэтуль невядомыя архіўныя матэрыялы з фондаў бібліятэкі Францыска Скарыны ў Лондане. У 2009 г. быў апублікаваны артыкул беларускага гісторыка Э.С. Ярмусіка "Рымска-каталіцкія манастыры ў сацыяльным і духоўным жыцці Беларусі (30-я гг. XX – пачатак XXI стст.)" [8]. У працы ахарактарызавана становішча і дзейнасць манаскіх кангрэгацый, паказана паўсядзённае манаскае жыццё, ахарактарызавана дабрачынная і асветніцкая праца законных сясцёр. Аўтарам былі выкарыстаны дакументы з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, а таксама з Архіва новых актаў у Варшаве. У тым жа годзе гісторыя і дзейнасць супольнасці назарэтанак закранаюся ў сумесным артыкуле Т.Р. Маліноўскай і Н.А. Маліноўскай-Франке "Гродзенскі брыгіцкі кляштар і назарэтанкі (1790-я – 1930-я гг.)" [9], дзе зроблены акцэнт на дзейнасць настаяцельніцы кляштара ў Гродне Паўлы Гажыч (1908–1934). Праца была напісана на падставе архіўных крыніц, якія знаходзяцца ў Нацыянальным гістарычным архіве ў Гродне і Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве.

У 2010-х гг. беларуская даследчыца Л. Міхайлік апублікавала шэраг навуковых артыкулаў, у якіх утрымліваюцца даныя пра манаскія супольнасці на тэрыторыі Гродзенскай дыяцэзіі ў міжваены перыяд [10–13]. Так, яе артыкул "Жаночыя законныя супольнасці на тэрыторыі Гродзенскай дыяцэзіі ў перыяд 1921–1939 гг." [10] прысвечаны аналізу адукацыйна-выхаваўчай, катэхетычнай, медыка-сацыяльнай дзейнасці кангрэгацый. У артыкуле "Гісторыя пляцовак сясцёр францішканак ад пакутуючых у Літве і Беларусі ў першай палове XX ст." [11] разгледжана дзейнасць толькі адной супольнасці. Важнае месца ў вывучэнні гісторыі супольнасці назарэтанак у беларускай гістарыяграфіі займае артыкул Л. Міхайлік "Праблема сацыяльнага забеспячэння ў Гродне ў 1921–1939 гг." [12]. У працы разгледжана дабрачынная дзейнасць сясцёр назарэтанак і сясцёр міласэрнасці Св. Вінцэнта дэ Поля ў Гродне (шарытак). Важнае месца займае манаграфія даследчыцы "Posłane, by służyć: dzieje domów Sióstr Franciszkanek od Cierpiących na Wschodzie" [14], апублікаваная на польскай мове ў Гродне ў 2009 г. Праца прысвечана дзейнасці бесхабітовых сясцёр францішканак. У працах быў выкарыстаны шэраг архіўных крыніц з Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Архіва новых актаў у Варшаве і ўласных архіваў манаскіх супольнасцей.

У беларускай гістарыяграфіі маецца і шэраг даследаванняў, прысвечаных асобным відам дзейнасці законніц: адукацыйна-выхаваўчай [15], медыцынскай [16]. Так, арганізацыю і ўтрыманне сёстрамі непакалянкамі прыватнай настаўніцкай жаночай семінарыі імя Марцэліны Дароўскай у Слоніме даследаваў В. Герасімчык [17]. У яго артыкуле былі выкарыстаны дакументы з Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці.

Некаторыя звесткі аб дзейнасці манаскіх жаночых супольнасцей на заходнебеларускіх землях у міжваенны перыяд можна сустрэць у сучасных перыядычных выданнях беларускага каталіцкага касцёла. Артыкулы пра стварэнне і дзейнасць жаночых каталіцкіх манаскіх супольнасцей на беларускіх землях былі апублікаваны ў часопісах "Наша вера" [18–20], "Ave Maria" [21], "Дыялог" [22], газеце "Каталіцкі веснік" [23].

У вывучэнні рымска-каталіцкіх манаскіх жаночых супольнасцей на заходнебеларускіх землях у міжваенны перыяд важную ролю адыгралі польскія даследчыкі. У адрозненні ад беларускіх, яны значна раней пачалі займацца дадзенай праблематыкай, падрыхтаваўшы шэраг абагульняючых прац. Так, у 1961 г. у працы Я. Бара (J. Bar) "Polskie zakony" [24] была разгледжана гісторыя ўтварэння і дзейнасці жаночых каталіцкіх манаскіх супольнасцей, якія працавалі на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у міжваенны перыяд. У 1970-я гг. у польскай гістарыяграфіі пачынаюць з'яўляцца працы, прысвечаныя дзейнасці асобных манаскіх супольнасцей. Адной з першых у поле ўвагі даследчыкаў трапіла супольнасць сясцёр місіянерак. У 1975 г. выйшлі дзве працы Я. Бара "Супольнасць Сясцёр Місіянерак Святой Сям'і" [25] і "Выбраныя лісты Баляславы Лямэнт. Супольнасць Сясцёр Місіянерак Святой Сям'і" [26]. У працах даследчык выкарыстаў шэраг архіўных крыніц, у большай ступені гэта былі дакументы з Архіва Супольнасці Сясцёр Місіянерак у Беластоку. У 1979 г. выйшла кніга А. Гранкевіч (A. Gronkiewicz), місіянеркі, якая актыўна карысталася ў сваёй працы архіўнымі дакументамі [27].

У 1987 г. выйшла грунтоўнае выданне Х. Стшэлецкай ( H. Strzelecka), прысвечанае сёстрам эўхарысткам, – "Пачаткі Супольнасці Сясцёр Служэбніц Езуса ў Эўхарыстыі (1923–1945)" [28], дзе ўпершыню былі апублікаваныя дакументы з уласнага архіва супольнасці сясцёр эўхарыстак.

У 1990-я гг. выходзіць яшчэ некалькі прац, прысвечаных дзейнасці супольнасці сясцёр місіянерак. Выданні падрыхтаваныя польскімі даследчыкамі А. Гранкевіч [29], Я. Стабінскай [30], Г. Васілеўскай [31]. У 1999 г. была апублікавана праца М. Стажынскай "Адзінаццаць мучаніц" [32], прысвечаная дзейнасці назарэтанак. Праца была надрукавана пасля таго, як у 1999 г. Папам Рымскім Янам Паўлам II былі беатыфікаваны адзінаццаць мучаніц сясцёр назарэтанак. Невялікая частка гэтай працы прысвечана менавіта з'яўленню і дзейнасці законніц на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Перавыдадзена была ў 2015 г.

У 2000-х гг. у польскай гістарыяграфіі з'яўляецца даволі шмат навуковых прац па пазначанай праблематыцы. Супольнасць назарэтанак даследавала Т. Гурская (T. Górska) [33]. У яе працы былі выкарыстаны дакументы з архіва назарэтанак Варшаўскай правінцыі, хронікі дома Звеставання Найсвяцейшай Панны Марыі ў Гродне, пратаколы пасяджэнняў рады (1926–1939). У пазначаны перыяд гісторыяй змёртвыхпаўстанак займалася

М.Л. Містэцкая (M.L. Mistecka) [34], а дзейнасці назарэтанак прысвечана праца А. Звярко (A. Zwierko) [35]. У 2007 г. была апублікавана кніга А. Мірэк (A. Mirek) [36], у якой прадстаўлена кароткая характарыстыка амаль 150 жаночых ордэнаў і кангрэгацый.

У 2010-х гг. польскія даследчыкі актыўна займаліся вывучэннем кангрэгацый, якія дзейнічалі на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у складзе ІІ Рэчы Паспалітай. У гэты перыяд з'яўляюцца і абагульняючыя працы. Так, у 2016 г. у Ломжы была выдадзена кніга Я. Фібэка (J. Fibek) "Dzieje parafii i klasztorów katolickich na Białorusi" [37]. У сваёй працы даследчык выкарыстаў шэраг дакументаў з касцёльных і дзяржаўных архіваў Беларусі і Літвы. У 2017 г. быў апублікаваны артыкул М. Халабурды (M. Hałaburda) "Diecezja pińska (1925–1939). Rys historyczny" [38]. У шостым раздзеле даследчык характарызуе дзейнасць мужчынскіх і жаночых манаскіх кангрэгацый Пінскай дыяцэзіі. У артыкуле аўтар выкарыстаў шэраг архіўных дакументаў (Архіў дыяцэзіальны ў Драгічыне), а таксама матэрыялы перыядычных выданняў тых часоў ("Piński Przegląd Diecezjalny").

У дадзены перыяд былі апублікаваны працы, прысвечаныя і асобным жаночым манаскім супольнасцям. У 2013 г. на беларускай мове выйшла кніга польскай даследчыцы А. Х. Скалік [39], прысвечаная заснавальніцам кангрэгацыі змёртвыхпаўстанак на тэрыторыі Беларусі. У працы былі выкарыстаны матэрыялы з Генеральнага архіва супольнасці. У 2019 г. быў апублікаваны артыкул Б. Аструвка (B. Ostrówka) [40], прысвечаны дзейнасці сясцёр палатынак у мясцовасці Райца (сучасны Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці). У даследаванні была выкарыстана значная частка архіўных крыніц, а менавіта дакументы Архіва Польскай Правінцыі Сясцёр Палатынак.

**Заключэнне.** Такім чынам, можна зрабіць выснову, што комплексных навуковых даследаванняў у беларускай гістарыяграфіі, прысвечаных вывучэнню рымска-каталіцкіх жаночых манаскіх супольнасцей 1921–1939 гг., не існуе. У канцы 90-х гг. ХХ ст. у беларускай гістарыяграфіі пачынаюць з'яўляцца адзінкавыя даследаванні пэўнага перыяду, рэгіёну або асобнай супольнасці. Аўтарамі выступалі пераважна прадстаўнікі каталіцкага духавенства ці манаскіх кангрэгацый, альбо гэтыя працы выходзілі пад патранажам касцёла. У канцы 2000-х гг. з'яўляюцца працы свецкіх беларускіх даследчыкаў. У значнай колькасці прац айчыннай гістарычнай навукі разгледжаны асобныя аспекты дзейнасці манаскіх аб'яднанняў. Беларускія даследчыкі ў сваіх працах выкарыстоўвалі дакументы архіваў Беларусі, Літвы і Польшчы, а таксама ўласных архіваў розных кангрэгацый.

У польскай гістарыяграфіі даследаванні па пазначанай тэме з'явіліся яшчэ ў 1960-х гг. У 1990 – 2000-я гг. іх колькасць значна ўзрастае, аднак працы пераважна датычацца ўсёй польскай тэрыторыі, а таму манаская дзейнасць на землях Гродзенскай і Пінскай дыяцэзій мала вывучана. Толькі з 2010-х гг. пачалі з'яўляцца працы польскіх гісторыкаў, якія былі прысвечаны менавіта беларускім землям.

ЛІТАРАТУРА


1. Konstytucja Rzeczypospolitej Polskiej z dnia 17 marca 1921 : z uwzględnieniem zmian ustalonych ustawą z dnia 2 sierpnia 1926 roku, zmieniającą i uzupełniającą Konstytucję Rzeczypospolitej Polskiej z dnia 17 marca 1921 roku. – Lwów; Warszawa: Książnica-Atlas, 1927. – 160 s.
2. Ружанцовыя разважанні = Rozważania Różańcowe / Склад. ксендз пралат Міхаіл Сапата. – Мінск: ВУП Выд-ва "Про Хрысто", 2001. – 330 с.
3. Пра пакліканне. Ружанцовыя разважанні / Камісія па справах Божага культу і дысцыпліны сакрамэнтаў пры КПББ. – Мінск: Про Хрысто, 2005. – 202 с.
4. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – 368 с.
5. Zharnasek A. Dzieje marianów w Drui w latach 1923–1938: Praca magisterska pisana na seminarium z historii Koscioła pod kierunkiem ks. prof. dra hab. Marka Zahajkiewicza. – Lublin: Katolicki Uniwersytet Lubelski, 2005. – 123 s.
6. Arliankovich N. Apostolski wymiar charyzmatu Zgromadzenia Siostr Sluzebnic Jezusa w Eucharystii: Praca magisterska napisana w Papieskim Wydziale Teologicznym w Warszawe Sekcja sw. Jana Chrzciciela na seminarium z teologii duchowosci pod kierunkiem o. prof. dra hab. Marka Sokolowskiego SJ. – Warszawa–Wilno, 2005. – 138 s.
7. Надсан А. Pro patria aliena. – Мінск: Беларускі Гістарычны Агляд, 2006. – 159 с.
8. Ярмусік Э. Рымска-каталіцкія манастыры ў сацыяльным і духоўным жыцці Беларусі (30-я гг. ХХ ст. – пачатак ХХІ ст.) // Веснік Брэсцкага універсітэта. – 2009. – № 2(37). – С. 5–13.
9. Маліноўская Т.Р., Маліноўская-Франке Н.А. "Гродзенскі брыгіткі кляштар і назарэтанкі (1790-я – 1930-я гг.) // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зб. навук. арт. У 2 ч. – Ч. 2 / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Э.С. Ярмусік. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С. 320–326.
10. Міхайлік Л. Жаночыя законныя супольнасці на тэрыторыі Гродзенскай дыяцэзіі ў перыяд 1921–1939 // Studia Theologica Grodnensia: зб. навук. арт. – Гродна, 2007–2011. – № 5. – С. 63–74.
11. Міхайлік Л. Гісторыя пляцовак сс. Францішканак ад пакутуючых у Літве і Беларусі ў першай палове ХХ ст. // Studia Theologica Grodnensia: зб. навук. арт. – Гродна, 2007–2010. – Вып. 4. – С. 180–192.
12. Міхайлік Л. Праблема сацыяльнага забеспячэння ў Гродне ў 1921 – 1939 гг. // Гарадзенскі палімпсест. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2012. – С. 341–368.
13. Міхайлік Л. Каталіцкі Касцёл у грамадскім і палітычным жыцці Гродна ў 1921 – 1939 гг. // Гарадзенскі палімпсест. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2011. – С. 444–462.
14. Michajlik L. Posłane, by służyć: dzieje domów Sióstr Franciszkanek od Cierpiących na Wschodzie. – Grodno: Гродзенская друкарня, 2009. – 192 с.
15. Аўсейчык Ю.А. Адукацыйна-выхаваўчая і дабрачынная дзейнасць жаночых манаскіх рымска-каталіцкіх кангрэгацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. арт. VI міжнар. навук. канф., Полацк, 28–29 крас. 2022 г. / Полац. дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк: Полац. дзярж. ун-т імя Еўфрасінні Полацкай, 2023. – С. 182–184.

16. Аўсейчык Ю.А. Дзейнасць у галіне медыцыны жаночых манаскіх рымска-каталіцкіх кангрэгацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. // Религия и общество – 17: сб. науч. ст.: [материалы науч. тр. участников XVII Междунар. науч.-практ. конф., г. Могилев, 21 апр. 2023 г.] / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко, Э.В. Старостенко. – Могилев, 2023. – С. 78–80.
17. Герасімчык В.У. Жаночая семінарыя імя М. Дароўскай у Слоніме (1919–1936) // Адукацыя на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 30–31 сак. 2010 г. / рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.). – Віцебск, 2010. – С. 144–147.
18. Жарнасек І. Лясная канвалія // Наша вера. – 2003. – № 3. – С. 47–51.
19. Жарнасек І. Яе лёс – нібы цэлая эпоха // Наша вера. – 2007. – № 1(39). – С. 26–29.
20. Левандоўская І. Прыклад для няверуючых – турэмны лёс сястры Ванды Банішэўскай // Наша вера. – 2014. – № 4. – С. 31–37.
21. Жарнасек І. Нябачны анёл // Ave Maria. – 2017. – № 9. – С. 18–19.
22. Каралёў П. Каштоўны дар Уршулі Ледухоўскай // Дыялог. – 2024. – № 4(329). – С. 21–23.
23. Івашчонак А. Сястра Тадэя Касцюшка // Каталіцкі веснік. – 2011. – № 6. – С. 7.
24. Bar J. Polskie zakony // Prawo Kanoniczne. – 1961. – № 4/1-4. – S. 421–592.
25. Bar J. Zgromadzenie Siostr Misjanarek Swiętej Rodziny. – Rzym, 1975. – 117 s.
26. Bar J. Wybor pism Bolesławy Lament. Zgromadzenie Siostr Misjanarek Swiętej Rodziny. – Białystok, 1975. – 185 s.
27. Gronkiewicz A. Zgromadzenie Siόstr Misjanarek Swiętej Rodziny w latach 1939–1947. – Nakładem Zgromadzenie SS. Misjanarek sw. Rodziny, 1979. – 115 s.
28. Strzelecka H. Początki Zgromadzenia Siostr Służebnic Jezusa w Eucharystii (1923–1945). – Warszawa: Akademia Teologii Katolickiej, 1987. – 302 s.
29. Gronkiewicz A. Życie i działalność Bolesławy Marii Lament (1862–1946). Założycielki Zgromadzenie Siostr Misjanarek sw. Rodziny. – Warszawa, 1990. – 354 s.
30. Stabińska J. Szukać i zbawiać. Posłannictwo Bolesławy Lament. – Warszawa: Wydaw. Archidiecezji Warszawskiej, 1991. – 175 s.
31. Василевская Г. На путях апостольства и экуменизма. – Люблин: [б. и.], 1992. – 78 с.
32. Стажиньская М. Одиннадцать мучениц / пер. с поль. Л. Михайлик. – Гродно: Гродн. Рим.-Катол. Епархия, 1999. – 74 с.
33. Górska T. 100 lat Siόstr Nazaretanek //„Nasza Przeszłość" – 2009. – T. 111. – S. 193–212.
34. Mistecka M.L. Zmartwychwstanki. Charyzmat i dzieje 1891–1991. – T. 2. – Lublin, 2000. –540 s.
35. Zwierko A. Wsłuchane w sygnały Ziemi Nowogródzkiej-wspomnienia o Nowogródczyźnie i Siostrach Nazaretankach z lat 1929–1945. – Wydawnictwo ASP Rymsza, 2003 –159 s.
36. Mirek A. Atlas żeńskiego ruchu zakonnego na ziemiach polskich w XIX i XX wieku. – Lublin: Petit Skład-Druk-Oprawa, 2007. –143 s.
37. Fibek J. Dzieje parafii i klasztorów katolickich na Białorusi. – Część 1: Diecezja Witebska. – T. 2: Zachodnia część diecezji Witebskiej. – Lomża, 2016. – 702 s.
38. Hałaburda M. "Diecezja pińska (1925–1939). Rys historyczny" // Textus et Studia. – 2017. – № 2(10). – S. 95–119.
39. Скалік А. Х. Слядамі благаслаўлёнай Маці Цэліны і Маці Ядвігі Бажэнцкіх у Беларусі / перакл. з поль. І. Жарнасек. – Гродна: Гродзен. дыяцэзія Рым.-катал. Касцёла ў Рэсп. Беларусь, 2013. – 63 с.
40. Ostrówka B. Zespół dworsko-parkowy w Rajcy. Przyczynek do historii Polskiej Prowincji Siόstr Misjonarek Apostolstwa Katolickiego (Pallotynki) // Archiwa, Biblioteki I Muzea Kościelne. – 2019. – № 112. – S. 277–295.

*Пастуліў 03.02.2026*

## ИСТОРИЯ ИЗУЧЕНИЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКИХ ЖЕНСКИХ МОНАШЕСКИХ КОНГРЕГАЦИЙ НА ТЕРРИТОРИИ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ (1921–1939 гг.)

***Ю.А. ОВСЕЙЧИК***
***(Национальный Полоцкий историко-культурный музей-заповедник)***

*В статье рассмотрена отечественная и зарубежная историография, посвященная деятельности женских монашеских конгрегаций на территории западнобелорусских земель в межвоенный период. Проанализированы основные направления научных работ церковных (как белорусских, так и польских) и советских исследователей. Прослежены основные этапы развития белорусской и польской историографии.*

***Ключевые слова:*** *белорусская историография, польская историография, Римско-католический костел, монашеская общность, конгрегации, межвоенный период, западнобелорусские земли.*

## HISTORY OF THE STUDY OF THE ACTIVITIES OF ROMAN CATHOLIC WOMEN'S MONASTIC CONGREGATIONS IN WESTERN BELARUS (1921–1939)

***Y. AUSEICHYK***
***(Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve)***

*The article examines the domestic and foreign historiography devoted to the activities of female monastic congregations in the Western Belarusian lands during the interwar period. The main directions of scientific work of ecclesiastical (both Belarusian and Polish) and secular researchers are analyzed. The main stages of the development of Belarusian and Polish historiography are traced.*

***Keywords:*** *Belarusian historiography, Polish historiography, Roman Catholic Church, monastic community, Congregations, interwar period, Western Belarusian lands.*